*І. І. Бамбешка*

# ДЗЕЙНАСЦЬ БЕЛАРУСКІХ КРАЯЗНАЎЦАЎ ПА ЗАХАВАННІ І ВЫВУЧЭННІ КУЛЬТАВАЙ АРХІТЭКТУРЫ ў 1920-я гг.

Адной з характэрных рыс грамадскага жыцця ў 1920–30-я гг. і сведчаннем адраджэння беларускай культуры стаў краязнаўчы рух. Ён склаў падмурак для правядзення буйнамаштабнага вывучэння Беларусі, якое разгарнулася ў паслярэвалюцыйны перыяд. Краязнаўцам была прапанавана шырокая праграма даследчых мерапрыемстваў, сярод якіх значнае месца займалі пытанні выяўлення, вывучэння і аховы гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі ўвогуле, культавага дойлідства ў прыватнасці.

Уцягненню краязнаўцаў у справу ўліку і вывучэння помнікаў гісторыі і культуры садзейнічалі рознага роду звароты да насельніцтва, якія з'яўляліся важнай формай прапаганды беражлівых адносін да помнікаў. Так, 25 ліпеня 1918 г. мастацка-археалагічны пададдзел аддзела народнай адукацыі Заходняй вобласці звярнуўся да навучэнцаў з заклікам «Арганізуйце, стварайце таварыствы, гурткі па ахове помнікаў мастацтва, старажытнасці, архіваў і інш.» [11, с.22]. Варта адзначыць, што такія пастановы пэўным чынам садзейнічалі разгортванню краязнаўчага руху і дапамагалі створаным арганізацыям сфармуляваць першыя задачы сваёй дзейнасці.

Вывучэнне і ахова культавай архітэктуры стала адной з галоўных задач Віцебскага акруговага таварыства краязнаўства (ВАТК), якое ўзнікла ў 1924 г.

Перш чым заняцца практычнымі мерапрыемствамі ў таварыстве, былі распрацаваны інструкцыйна-метадычныя матэрыялы. У неперыядычным краязнаўчым зборніку «Віцебшчына», які ўбачыў свет у 1925 г., быў змешчаны шэраг апытальных лістоў і інструкцый адпаведнай тэматыкі. Перш за ўсё ў ім звяртае на сябе ўвагу артыкул сябра таварыства М. М. Багародскага «Горад як прадмет краязнаўчага дасьледаваньня», які меў праграмны характар і быў агучаны на Віцебскай краязнаўчай канферэнцыі 26–27 красавіка 1925 г. [3, с.113]. У дакладзе М. М. Багародскага былі акрэслены асноўныя тэмы ў вывучэнні горада. Асобная ўвага надавалася вывучэнню і папулярызацыі мясцовых помнікаў гісторыі і культуры і менавіта помнікаў архітэктуры. Аўтар

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

прапаноўваў заняцца вывучэннем гісторыі будынкаў, даць іх мастацкае апісанне [3, с.114].

Шэраг публікацый метадычнага характару, змешчаных у зборніку «Віцебшчына», арыентаваў на збор і вывучэнне помнікаў. Адна з іх («Апытальны ліст») насіла больш агульны характар, паколькі была скіравана на выяўленне помнікаў гісторыі і культуры. Сярод шырокага кола разнастайных помнікаў згадваліся і помнікі архітэктуры. І калі ў першым выпадку аўтар не вылучаў асобныя катэгорыі помнікаў архітэктуры, то на гэты раз ён канкрэтызуе ўвагу даследчыкаў і згадвае «цэрквы, палацы, хаты й розныя будынкі». У адпаведнасці з інструкцыяй неабходна было на карце горада дакладна ўказаць месцазнаходжанне помніка, апісаць яго вонкавы і ўнутраны выгляд, адзначыць, калі і кім быў узведзены помнік, звярнуць увагу на яго адметнасці, стан захаванасці і, па магчымасці, прывесці яго план, а таксама «рысунак знадворку й з сярэдзіны» [1, с.132].

«Апытальны ліст для рэгістрацыі помнікаў будаўніцтва» насіў больш канкрэтны характар, паколькі тычыўся толькі адной катэгорыі помнікаў – помнікаў архітэктуры [2, с.124–125]. Прапаноўвалася сабраць аб’ёмную інфармацыю аб помніках: яго падрабязную назву, дату будаўніцтва, месцазнаходжанне, аўтара і г. д., матэрыял і тэхніку, аздабленні экстэр’ера і інтэр’ера і інш. Асобны пункт патрабаваў высвятліць, калі і кім гэты помнік вывучаўся, якія іншыя мастацкія помнікі выкарыстаны для аздаблення інтэр’ера. Усю пісьмовую інфармацыю пажадана было падмацоўваць не толькі планамі самога помніка, але і картамі і планамі мясцовасці, дзе ён размяшчаўся, а інфармацыю аб гісторыі помніка дапаўняць адпаведнымі дакументамі, прычым пры адсутнасці апошніх фіксаваць фальклорныя звесткі аб ім.

Такім чынам у таварыстве быў распрацаваны значны масіў інструкцыйнага матэрыялу, які дазваляў пачаць гісторыка-мастацкае вывучэнне помнікаў архітэктуры ўвогуле і культавай архітэктуры ў прыватнасці.

Аднак яшчэ да распрацоўкі згаданых інструкцый праца па вывучэнні культавай архітэктуры ўжо пачалася. Ужо на пасяджэнні 12 лістапада 1924 г. старшыня таварыства М. І. Каспяровіч выступіў перад сваімі калегамі з дакладам «Віцебская архітэктура ў гістарычнай перспектыве», які таксама быў змешчаны ў зборніку «Віцебшчына» [12, арк. 10; 5, с.37–39]. М. І. Каспяровіч даў кароткі агляд гісторыі развіцця архітэктуры горада, акрэсліў асноўныя

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

помнікі, паспрабаваў звязаць развіццё архітэктурных формаў з палітычным і эканамічным жыццём горада.

Распрацоўку названай тэмы працягнуў віцебскі краязнавец П. М. Красавіцкі («Архітэктура Віцебшчыны XVII–XVIII стст.») [5, с.192]. Пасля ім быў падрыхтаваны нарыс, прысвечаны асобнаму помніку – Ільінскай царкве. Аўтар даў падрабязнае апісанне яе вонкавага выгляду, унутранага аздаблення, спрабаваў вызначыць час яе стварэння, для чаго звярнуўся да прац сваіх папярэднікаў – А. П. Сапунова, А. М. Паўлінава і інш., і прыйшоў да высновы, што яна была пабудавана ў 1743 г. У дадатак да тэкставай інфармацыі краязнавец прыводзіў фотаздымкі царквы да і пасля рамонту 1887 г. [6]. У кастрычніку 1925 г. М. І. Каспяровіч звяртаўся ў ЦБК з просьбай надрукаваць у часопісе «Наш край» названы артыкул П. М. Красавіцкага [12, арк. 10]. Аднак публікацыя была зроблена толькі ў 1928 г. [6].

У 1926 г. адбыліся экскурсіі па Віцебску і акрузе, у час якіх былі агледжаны Храпавіцкая царква, будынкі Маркавага манастыра і інш., рабіліся пэўныя крокі для арганізацыі іх аховы [8, с.74]. Працягвалася вывучэнне культавай архітэктуры горада. Так, мясцовыя даследчыцы звярнуліся да гісторыі і асаблівасцей будынкаў Марыявіцкага кляштара (М. А. Мельнікава) і віцебскай Троіцкай царквы на Пескаватыку (М. Лебедзева) [7, с.86; 12, арк. 73]. М. Лебедзева ў сваім дакладзе адзначала, што вывучаны ёю помнік знаходзіцца ў вельмі дрэнным стане, і «калі не прыняць належныя меры да аховы, … дык ён у недалёкім часе разваліцца», таму неабходна прыняць меры па яе рэстаўрацыі [12, арк. 74].

У другой палове 1926 г. быў зроблены агляд Троіцкай царквы, пасля якога было прынята рашэнне сабраць усе яе фотаздымкі, прасіць Акруговы выканаўчы камітэт адрамантаваць царкву, адпусціўшы на гэта 6 тыс. руб., а для тэрміновай кансервацыі выдаткаваць 200 руб., перадаўшы наяўныя прадметы царкоўнага ўжытку для захавання ў іншую царкву [12, арк. 92]. Прыхаджане царквы звярнуліся да гарадскога кіраўніцтва з просьбай дабудаваць прытвор і званіцу да царквы. Аднак на пасяджэнні прэзідыума Віцебскага акруговага выканаўчага камітэта ад 20 ліпеня 1927 г. па дакладзе тагачаснага старшыні акруговага таварыства краязнаўства І. А. Бутара аб Чорнай царкве была вынесена пастанова, у якой адзначалася, што наяўная частка царквы не ўяўляе сабою ніякай гістарычнай і архітэктурнай каштоўнасці. І таму прапануемая вернікамі дабудоўка прытвору і званіцы «для адпраўлення

БІБЛІЯТЭКА БДПУ

рэлігійных абрадаў» была прызнана немэтазгоднай [9, арк. 84]. Тады вернікі напісалі наркому асветы БССР У. М. Ігнатоўскаму, у лісце да якога прасілі дазволу аднавіць будынак і згаджаліся перадаць у БДМ каштоўныя ў музейных адносінах рэчы [9, арк. 85–85 адв].

18 мая 1928 г. на пасяджэнні прэзідыума Віцебскага гарадскога савета па дакладзе аб становішчы Віцебскага аддзялення БДМ адзначалася, што паколькі будынак так званай Чорнай царквы разваліўся і па сваім стане не можа быць адноўлены як помнік архітэктуры XVII ст., даручыць музею неадкладна разабраць яго, пры гэтым усе рэчы, якія знаходзяцца ў царкве, перадаць у музей у прысутнасці дырэктара музея І. І. Васілевіча [10, арк. 20 адв.].

3 жніўня 1928 г. па загадзе рэдактара газеты «Рабочий» у Інбелкульт была адаслана фатаграфія гэтага знішчаемага помніка [13, арк. 61, 192]. На наступны дзень у той жа газеце з'явіўся артыкул віцебскага карэспандэнта В. Буравога «Зверская расправа с историческим памятником» [4].

7 жніўня таго ж года М. М. Багародскі накіраваў у Інбелкульт акт камісіі па справе разабрання царквы [13, арк. 64-64 адв.]. Інбелкульт, у сваю чаргу, зрабіў запыт у ЦБК, якое звярнулася да Віцебскага акруговага таварыства краязнаўства з просьбай паведаміць, «… кім і пры якіх умовах разабрана т. зв. Чорная царква» ў Віцебску, якую чыннасць мела ў гэтай справе акруговае таварыства і ці захаваны ад царквы старажытныя рэчы [10, арк. 75].

У адказе на запыт, адпраўлены 28 жніўня 1928 г., паведамлялася, што ў музей не трапілі толькі некалькі абразоў, украдзеных з-пад руін будынка значна раней да разборкі царквы, прычым сярод украдзеных толькі два абразы мелі некаторае музейнае значэнне» [10, арк. 66–66 адв.].

Падводзячы вынік, адзначым, што ў 1920-я гг. ВАТК адно з нямногіх у БССР разгарнула шырокую работу па выяўленні, вывучэнні і ахове помнікаў культавай архітэктуры. Была распрацавана грунтоўная навукова-метадычныя база для правядзення падобных даследаванняў. ВАТК было адзінай і да таго ж грамадскай арганізацыяй, якая паслядоўна на працягу некалькіх гадоў рабіла ўсё магчымае для захавання архітэктурнага помніка XVIII ст. – царквы «Чорнай Троіцы» ў Віцебску, і менавіта дзякуючы яму ўдалося захаваць большую частку яе старажытных царкоўных рэчаў.

БІБЛІЯТЭКА БГУКІ

1. *Апытальны* ліст // Віцебшчына: Неперыядычны орган Віцеб. акруговага т-ва краязнаўства; пад рэд. М. І. Каспяровіча. – Віцебск: Выданне таварыства, 1925. – Т. 1. – С. 130–132.

2. *Апытальны* ліст для рэгістрацыі помнікаў будаўніцтва // Віцебшчына: Неперыядычны орган Віцеб. акруговага т-ва краязнаўства; пад рэд. М. І. Каспяровіча. – Віцебск: Выданне таварыства, 1925. – Т. 1. – С. 124–125.

3. *Багародскі. М.* Горад як прадмет краязнаўчага дасьледаваньня / М. Багародскі // Віцебшчына: Неперыядычны орган Віцеб. акруговага т-ва краязнаўства; пад рэд. М. І. Каспяровіча. – Віцебск: Выданне таварыства, 1925. – Т. 1. – С. 113–116.

4. *Буревой, В.* Зверская расправа с историческим памятником / В. Буревой // Рабочий. – 1928. – 4 августа. – С. 2.

5. *Віцебшчына:* Неперыядычны орган Віцеб. акруговага т-ва краязнаўства / пад кіраўніцтвам і рэд. М. Каспяровіча. – Віцебск, 1925. – Т. 1. – 218 с.

6. *Красавіцкі, П.* Віцебская Ільінская царква / П. Красавіцкі // Запіскі аддз. гум. навук ІБК. – Кн. 6. – Працы камісіі гісторыі мастацтва. – Мінск, 1928. – Т. 1. – Сш. 1. – С. 92–103.

7. *М. К-ч.* Краязнаўчая праца на Віцебшчыне / М. К-ч // Наш край. – 1926. – № 4–5. – С. 86–89.

8. *М. К-ч.* На Віцебшчыне / М. К-ч // Наш край. – 1926. – № 10–11. – С. 73–74.

9. *Нацыянальны* архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 42. – Воп. 1. – Спр. 1926.

10. *НАРБ.* – Ф. 42. – Воп. 1. – Спр. 1935.

11. *Советское* законодательство о памятниках истории и культуры: сб. документов и материалов (1917–1972 гг.). – Минск: Полымя, 1972. – 430 с.

12. *Цэнтральны* навуковы архіў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (ЦНА НАНБ). – Ф. 67. – Воп. 1. – Спр. 5.

13. ЦНА НАНБ. – Ф. 67 – Воп. 3. – Спр. 21.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ